

# ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫЯ ГЕРБЫ – ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

**Геральдычная спадчына Беларусі** ўяўляе сабой даволі значны аб'ём як **прыватнаўласніцкіх**, так і **тэрытарыяльных гербаў**. У нашай сучаснасці, на фоне адыходу гербаў прыватных асоб у гісторыю, асаблівую актуальнасць набываюць менавіта гербы **тэрытарыяльныя**. Да апошніх адносяцца, напрыклад, гербы **дзяржаў, абласцей, гарадоў** і іншых тэрытарыяльных адзінак.

**Герб** уяўляе сабой унікальную матэрыялізацыю нематэрыяльнага сімвала населенага пункта ў выглядзе малюнка, выкананага ў адпаведнасці з геральдычнымі правіламі і абавязкова зацверджанага ўпаўнаважанымі органамі дзяржаўнай улады. У апошняй рэдакцыі **Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны"** (2012 г.) адзначаецца, што да нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей адносіцца, апрача іншага, і **змест** геральдычных аб'ектаў [2]. Менавіта сімвалічная значнасць герба паўплывала на прыняцце рашэння аб унясенні шэрагу гарадскіх гербаў у **Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь** [6, с. 674 – 676].

У адпаведнасці з узгаданым вышэй Законам права на **герб і флаг** у нашай краіне прадастаўлена **адміністрацыйна-тэрытарыяльным і тэрытарыяльным адзінкам** [1]. Рэалізацыя гэтага права адкрывае перад мясцовымі ўладамі вялізарныя магчымасці. Выхаванне патрыятызму ў маладога пакалення краіны пачынаецца з развіцця пачуцця любові да сваёй "малой" радзімы, сімвалам якой з'яўляецца яе герб. Менавіта папулярызацыя геральдычных сімвалаў гарадскіх і вясковых населеных пунктаў дазваляе ў поўным памеры сфарміраваць у іх жыхароў адпаведны светапогляд і гонар за сваю краіну.

Тэрытарыяльныя гербы Беларусі, як **адноўленыя**, так і **наватворныя**, бяспрэчна павінны займаць як мага больш значнае месца ў жыцці населеных пунктаў. У сувязі з гэтым паўстае праблема **пашыранага выкарыстання мясцовых гербаў**. Заканадаўства дазваляе размяшчаць гербы і флагі адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак у іх будынках, памяшканнях пасяджэнняў і службовых кабінетах кіраўніцтва, а таксама ў тых месцах, дзе ў адпаведнасці з заканадаўствам прадугледжана знаходжанне **Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь** і **Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь**. Сімвалы населеных пунктаў могуць выкарыстоўвацца таксама падчас дзяржаўных, народных, працоўных святаў і мерапрыемстваў, прымеркаваных да памятных падзей і ўрачыстасцяў [1].

Гістарыяграфія беларускай тэрытарыяльнай геральдыкі, пачатак фарміравання якой храналагічна адносіцца да **XVI ст.**, налічвае дастаткова багаты аб'ём матэрыялаў. Вельмі значны ўнёсак у вывучэнне геральдыкі Беларусі, як прыватнаўласніцкай, так і тэрытарыяльнай, быў зроблены ў **канцы XX – пачатку XXI ст.** Менавіта ў гэты перыяд з'яўляюцца работы **А.К. Цітова**, прысвечаныя праблемам гарадской геральдыкі краіны [8, 9]. У кнізе **"Геральдыка беларускіх местаў"** (1998 г.) сабраны выявы гербаў, пячатак і кароткія нарысы гісторыі шэрагу беларускіх гарадоў. Даследчык уздымае таксама праблемы перыядызацыі гісторыі гарадской геральдыкі і яе класіфікацыі.

**Першай спробай** апублікаваць выявы, апісанні і гісторыю гарадскіх і раённых гербаў, унесеных ў **Гербавы Матрыкул Рэспублікі Беларусь**, з'явілася выданне **С.Я. Рассадзіна** і **А.М. Міхальчанкі "Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі"** (2005 г.). У ім прыводзіцца пералік гербаў і флагаў, афіцыйна зацверджаных у перыяд з **1991 па 2004 гг.** [7].

Значным укладам у справу папулярызацыі тэрытарыяльных гербаў і флагаў Беларусі стала кніга **У.І. Адамушка** і **М.М. Елінскай "Гербы и флаги Беларуси"** (2006 г.). Для шырокага кола чытачоў ва ўступнай частцы ідзе гавор-

ка аб асновах геральдыкі і вексілалогіі. У кнігу ўключаны звесткі аб гербах і флагах **150** адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак, унесеных у **Дзяржаўны Геральдычны рэгістр Рэспублікі Беларусь** [4].

У мэтах больш шырокага знаёмства (у першую чаргу, жыхароў Віцебскай вобласці) з тэрытарыяльнымі гербамі рэгіёна **У.І. Адамушка, М.М. Елінская і С.В. Рублеўскі** выдаюць **"Геральдычны вянок Віцебшчыны"** (2010 г.) [3]. У кнізе прадстаўлены гербы і флагі як самой вобласці, так і гарадоў і іншых населеных пунктаў Віцебшчыны. Ва ўводнай частцы, у прыватнасці, раскрываецца практыка выкарыстання геральдычных сімвалаў у жыцці Віцебска. Гербам упрыгожваюць вуліцы горада, ён выкарыстоўваецца падчас шматлікіх святочных мерапрыемстваў і, такім чынам, гарадская сімволіка становіцца неад'емнай часткай жыцця віцябчан.

**Самай значнай** падзеяй у сучаснай гістарыяграфіі беларускай тэрытарыяльнай геральдыкі стала энцыклапедычнае выданне **"Современная геральдика Беларуси" У.І. Адамушкі** і **М.М. Елінскай** (2012 г.) [5]. Трэба адзначыць, што гэта кніга мае ўдалую структуру, багаты ілюстрацыйны матэрыял і выканана на высокім паліграфічным узроўні.

У **звароце** да чытача аўтары засяроджваюць увагу на значнасці тэрытарыяльных гербаў як помнікаў нашай гісторыі і культуры. **Уводная частка** знаёміць з асновамі тэарэтычнай і практычнай геральдыкі і вексілалогіі. Неабходнасць падобных уводзінаў праверана часам: аналагічныя работы замежных і айчынных аўтараў XIX – XX стст. традыцыйна распачыналіся менавіта асвятленнем геральдычнай гісторыі і правілаў складання і выкарыстання гербаў.

Дарэчы, у беларускай тэрытарыяльнай геральдыцы склалася і **свая вельмі станоўчая традыцыя** вызначэння часу заснавання герба адпаведнай **формай шчыта**. Для старадаўніх гербаў прынята выкарыстанне **барочнага шчыта**: гербы, заснаваныя ў перыяд знаходжання Бе-




ларусі ў складзе **Расійскай імперыі**, размяшчаюцца на **французскіх**, а **наватворныя** – на **іспанскіх** ці **варажскіх** па форме шчытах.

Аўтары паспяхова справіліся са складанай задачай зрабіць для сучаснага чытача кароткі агляд асноў геральдычнай навукі і вексілалогіі і паказалі дасягненні сучаснай тэрытарыяльнай геральдыкі Беларусі.

**Асноўная частка** выдання прысвечана менавіта тэрытарыяльнай геральдыцы Беларусі. У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам краіны, у алфавітным парадку прыводзяцца **гербы і флагі беларускіх населеных пунктаў**. Ілюстрацыйны матэрыял не абмяжоўваецца выявамі гэтых сімвалаў і паказвае іншыя бакі гісторыі і сучаснага жыцця беларускіх гарадоў і вёсак. Аўтары распавядаюць таксама і аб самім працэсе стварэння герба і флага, абгрунтоўваюць выявы, інфармуюць аб аўтарах зацверджаных праектаў.

Кніга мае вельмі карысны **дадатак** – **спіс адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак**, гербы і флагі якіх унесены ў **Дзяржаўны рэгістр Рэспублікі Беларусь** (на **1 студзеня 2012 г.**). Спіс мае разбіўку па абласцям і дае магчымасць хуткага пошуку неабходных звестак па наяўнасці і часе заснавання адпаведнага герба ці флага.

Неабходна таксама адзначыць, што гэта выданне аказвае канкрэтную дапамогу пры выкладанні **вучэбнага курса "Геральдыка"** у вышэйшых навучальных установах краіны.

Значнасць гэтай кнігі відавочная, а з цягам часу яна набудзе яшчэ большую каштоўнасць.

1. Аб афіцыйных геральдычных сімвалах: Закон Рэсп. Беларусь, 26 мая 2012 г., № 384-3 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2013. – № 63. – 2/1936.

2. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны: Закон Рэсп. Беларусь, 9 студзеня 2006 г., № 98-3: у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 8 мая 2012 г. № 374-3 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2012. – № 56. – 2/1926.

3. Адамушка, У.І., Елінская, М.М., Рублеўскі, С.В. Геральдычны вянок Віцебшчыны / У.І. Адамушка, М.М. Елінская, С.В. Рублеўскі. – Віцебск : Віцеб. абл. друк., 2010. – 92 с.

4. Адамушко, В.И., Елинская, М.М. Гербы и флаги Беларуси / В.И. Адамушко, М.М. Елинская. – Минск : Беларусь, 2006. – 253 с.

5. Адамушко, В.И., Елинская, М.М. Современная геральдика Беларуси / В.И. Адамушко, М.М. Елинская; Департамент по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь. – Минск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. – 536 с.: ил.

6. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: [даведнік] / М-ва культуры Рэсп. Беларусь; склад.: В.Я. Абламскі, І.М. Чарняўскі, Ю.А. Барысюк. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 680 с.

7. Рассадзін, С.Я., Міхальчанка, А.М. "Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі" / С.Я. Рассадзін, А.М. Міхальчанка. – Мінск: Беларусь, 2005. – 128 с.

8. Цітоў, А.К. Гарадская геральдыка Беларусі / А.К. Цітоў. – Мінск : Полымя, 1989. – 205 с.

9. Цітоў, А.К. Геральдыка беларускіх месцаў (XVII – пачатак XX ст.) / А.К. Цітоў. – Мінск : Полымя, 1998. – 284 с.

***Ірына Колабава***

*дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, член Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук*